мастацкіх традыцый, станоўча паўплывала на развіццё гэтага віду мастацтва.

---

1. *Арава Э.В.* Леў Меeравіч Лейтман. – Мн.: Беларусь, 1976. – С. 8.

2. *Выстаўка* твораў народнага мастака БССР прафесара В.В.Волкава, прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння і 55-годдзю творчай дзейнасці: Каталог / Аўт.уст.артыкула П.Нікіфараў. – Мн.: Звязда, 1958.

3. *Выстаўка* твораў М.Л.Тарасікава, прысвечаная 35-годдзю творчай дзейнасці: Каталог / Аўт. уст. артыкула Я.Я.Красоўскі. – Мн., 1963.

4. *Праграма* па мастацтву Беларускага дзяржаўнага мастацкага тэхнікума // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф.837, воп.1, арк.20, адв. 1.

5. *Праграма* па мастацтву Беларускага дзяржаўнага мастацкага тэхнікума // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф.837, воп.1, арк.20, адв. 2.

6. *Рынкевіч У.* Неафіцыйны Лейтман // Мастацтва. – 2001. – № 10. – С. 38.

*Т.П.Раскашанская*

## САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ МАДЫФІКАЦЫІ Ў КАНТЭКСЦЕ ІДЭЙ АСВЕТНІЦТВА

У гісторыі культуры ў першыя тры чвэрці XYIIIст. усталёўваецца новая эпоха. У гэты час здзяйсняецца прарыў “ад цемры да святла розуму”. Новая эпоха ўвайшла ў гісторыю пад назвай “Асветніцтва”. Яна адзначана станаўленнем, росквітам і крызісам цэлага комплексу ідэй, грамадскіх настрояў, формаў паводзін, культурных пераваг, мэтанакіраванымі прадвяшчэннямі наступлення новага веку навуковага і духоўнага прасвятлення. Эпоха, насычаная крытычным пафасам, эпоха, якая пераацэньвала ўсё, што адносілася да чалавечага быцця з яго “светам знешнім і светам унутраным”, “білася ў цянётах страшэнных супярэчнасцей”. Характэрная рыса таго часу – працяглая аберацыя пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ацэнцы Асветніцтва ў яго вытоках, ва ўсіх перыпетыях светаўспрымання. Новы культурны напрамак, які злучыў у сабе вальнадумства, свецкі характар гуманізму і засвоіў элементы рэлігійнай і палітычнай свабоды пратэстантызму, усёабдымна ўплываў на культурнае і сацыяльнае жыццё Заходняй Еўропы XYIII ст. У комплексе даволі вострых праблем актуалізавалася ўсвядомленая патрэбнасць у абнаўленні чалавечага жыцця.

Асветніцтва стала першай уплывовай і дамінуючай плынню культуры новага часу, дзе секулярызацыя знайшла сваё паслядоўнае ўвасабленне. Секулярызацыйныя імкненні гуманістычнай эпохі вынікалі з індывідуалістычнай крыніцы, у аснову якой было пакладзена глыбокае перакананне ў высокай годнасці права на ўсебаковае развіццё якасцей асобы. Атрымаўшы ў спадчыну ад гуманістаў свабоду думкі і імкненне да выпрацоўкі светасузірання на чыста свецкіх пачатках, асветнікі XYIII ст. сталі абаронцамі той свабоды, аб якой упершыню было заяўлена ў пратэстанцкім руху. Ідэя асабістага права з тым маральным і сацыяльным адценнем, які ёй надавалі папулярныя ў XYIII ст. ідэі чалавечнасці і народнага дабрабыту, была прасякнута альтруізмам і мела грамадскі характар. Новая гісторыя культуры Заходняй Еўропы, дзякуючы развіццю асабістага пачатку, набыла характар свядомай пастаноўкі і прынцыповага рашэння грамадскіх пытанняў, задавальнення духоўных імкненняў і матэрыяльных патрэбнасцей.

Усю сістэму светаадносін як асветніцкага кірунку вызначала пакланенне татальнаму і самагоднаму розуму. Рацыяналізм становіцца інструментам пазнання ўсіх з'яў і фактаў дзяржаўнага, грамадскага, прыватнага жыцця і нават рэлігійнага веравызнання. Дзякуючы глыбокай веры ў розум, правы і абавязкі людзей разглядаліся самі па сабе, а ў аснову сваіх вучэнняў асветнікі паклалі абстрактнае разуменне прыроды чалавека. У выніку рацыяналізм атрымаў універсальны характар і здольнасць да шырокага распаўсюджвання. Узведзены ва універсальны пазнавальны прынцып розум (натуральны закон) разглядаўся ў якасці універсальнага ключа ў разуменні чалавека. Мэтай гісторыі стаў паказ руху народаў па шляху прагрэсу, дзе будучае было ўключана ў якасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арыенціра для сучаснага. Для сучаснага быў неабходны сінтэз навукова-тэхнічных дасягненняў і духоўнай культуры, які мог ажыццяўляцца толькі на аснове адзінай сістэмы ўласнасці. Транфармацыя прынцыпаў свабоды асобы і права на ўласнасць з сакральных каштоўнасцей у свецкую праграму дзеяння выклікала новы кірунак ідэалогіі – лібералізм. Заснаваны на прызнанні толькі роўнага для ўсіх людзей права дабівацца сваіх мэт, лібералізм зацвердзіў гэта права адпаведнымі законамі і палітычнай сістэмай. Замацаванае грамадзянскае права ў Дэкларацыі праў чалавека і грамадзяніна (26 жніўня 1789 г.) стала важным кампанентам сацыякультурнай рэгуляцыі.

Агульначалавечы пафас хрысціянства і ідэя свабоды былі аб'яднальнай і сінтэзуючай асновай, ствараючы агульны духоўны фон культурнага ўзаемапранікнення еўрапейскіх народаў. Еўропа, падрыхтаваная ідэямі Асветніцтва, стала адзінай культурнай прасторай з агульнай духоўнай традыцыяй і шмат у чым агульным лёсам. Ідэі Асветніцтва знаходзілі тысячы паслядоўнікаў у розных краінах Еўропы, бо яны грунтаваліся на агульначалавечых пачуццях і ідэалах, не кранаючы нацыянальныя, рэлігійныя, культурныя асаблівасці.

Значную ролю ў станаўленні асобы адыграла свецкая культура, якая давала чалавеку арыенціры свабоднай дзейнасці і магчымасць найбольш поўнай самарэалізацыі. Свецкая літаратура ў выніку хуткага развіцця і агульнаеўрапейскага распаўсюджвання, “палітыка асветнага абсалютызму” садзейнічалі і пэўнай верацярпімасці. Талерантнасць, цярпімасць у адносінах да ідэй патрабавалі адзінага чалавечага свету, дзе перашкоды, звязаныя з традыцыямі, перасякаліся б з імкненнем да аб'яднання. Праяўляючы клопат аб тым, каб філасофскія, палітычныя, эканамічныя ідэі сталі набыткам шырокага кола грамадства, асветнікі імкнуліся ўвасобіць іх у форму займальнага развагання і сатырычнага выкрывання. Фарміруючы грамадскую думку і адначасова адчуваючы яе ўплыў, перыядычныя выданні мелі камерцыйны характар, матэрыяльна залежалі ад густаў і схільнасцей сваіх чытачоў. Поспехі такой палітыкі адлюстроўвалі тыражы друкаваных выданняў, сярод якіх расла колькасць забаўляльных і павучальных штотыднёвікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рост самасвядомасці сацыяльных нізоў, грамадская вага і ўплыў сярэдніх слаёў садзейнічалі паскарэнню тэмпу развіцця эканомікі, што было абумоўлена пашырэннем спажывецкага попыту, а значыць, і ростам іх дабрабыту. Ва ўмовах камерцыялізацыі адпачынку і вольнага часу, літаратуры, мастацтва, нават навукі, з'яўлялася магчымасць усё больш уздзейнічаць на развіццё культуры, якая яшчэ не так даўно была пад непадзельным кантролем традыцыйнай эліты.

Асветнікі праз разнастайныя спосабы сацыялізацыі асобы далучалі да каштоўнасцей культуры ўсіх, хто, незалежна ад паходжання, працай, ведамі, грамадзянскімі ўчынкамі даказваў сваю здольнасць іх прыняць. Тэндэнцыя да перамешвання класаў, якім суправаджаліся розныя формы калектыўнай забаўляльна-адпачынкавай дзейнасці і палітычнага жыцця, вяла да прамога кантакту з асветніцкай элітай шырокіх слаёў насельніцтва, садзейнічаючы далучэнню іх да новых каштоўнасцей праз перайманне яе густаў і звычак. Праблемы этычнага характару, узнятыя мысліцелямі Асветніцтва, знаходзілі пацвярджэнне ў жыцці. Грамадства, узнікшы з імкнення людзей да зносін, неабходнасці іх і ў тым ліку карыснасці, павялічвала магчымасці задавальнення патрэбнасцей асобы. Імкненне да цесных, нефармальных зносін з аднадумцамі садзейнічала з'яўленню шматлікіх гурткоў і аб'яднанняў па інтарэсах. Значнай сярод іх з'явілася група стваральнікаў "Энцыклапедыі" (1751–1772). Выключнае значэнне яе было не толькі ў тым, што ў ёй падавалася ў сістэматызаваным выглядзе сукупнасць чалавечых ведаў, а і ў тым, што стваральнікі "Энцыклапедыі" звярталіся "да ўсіх і кожнага". Французская "Энцыклапедыя" паклала пачатак устаноўцы звяртацца да ўсіх адрасатаў аднолькава і прапаноўваць ім глыбокі змест.

Асветніцкая ідэя, заснаваная на адзінстве ў разуменні фундаментальных асноў эстэтычнага густу, была пэўным аб'яднальным фактарам людзей, розных па паходжанні, стане ў грамадстве, саслоўі, але здольных вызначаць агульныя прынцыпы ацэнкі мастацкіх з'яў. Такім відам мастацтва, які найбольш актыўна і непасрэдна ўздзейнічае на ўнутраны свет чалавека, з'яўлялася музыка. У сваёй структуры і руху

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

поліфанічнай сутнасці музыка зрабіла барацьбу трансцэндэнтных сіл непасрэдна адчувальна паглыбленай у чалавечыя пачуцці. Неадольная па ўнутраным дакрананні, яе невычэрпная сімволіка зразумелая ўсім, таму што адкрывае шлюзы да самых агульных глыбінь і разлівае ў струменях мелодый напоўненыя трансцэндэнцыяй пачуцці. У XYIII ст. гэтая універсальная мова чалавецтва аказала ўздзеянне на характар свядомага ўлоўлівання яго душэўна-духоўных рухаў, вызваляючы ад дагматычных путаў, у якія яны былі заключаны. У музыцы гэтае стагоддзе знайшло новую ўсёахопную мову чалавецтва і давяло яе да кульмінацыі, паказваючы ўсю складанасць чалавечай прыроды. Словы Шылера аб свабодзе ў спалучэнні з трыумфальнай музыкай фіналу Дзевятай сімфоніі Бетховена (“Абнімiцеся, мільёны…”) маглі ў гаворачых вобразах стварыць са сваёй узнятай у паняційныя вяршыні душэўнай усхваляванасці тысячу формаў, якія з таго часу ўздзейнічаюць на наша жыццё. Значэнне музыкі як элемента культуры ўзрастала па меры секулярызацыі публічнага жыцця. Да ўсведамлення чалавекам музыкі як свяшчэннай сілы, як крыніцы эмацыянальнага ўзрушэння, як гульні ў XYIII ст. дадаецца, на думку Й.Хейзінга, “чацвёрты від свядомай ацэнкі – як змястоўнае напаўненне жыцця, як выяўленне жыццёвага пачуцця”. З гэтага часу музыка выступае сродкам шматграннага ўвасаблення сацыяльных ідэй, уніфікаванага выяўлення грамадскай псіхалогіі і як сацыялізуючая функцыя, якая садзейнічае выпрацоўцы каштоўнасных арыентацый асобы, узнятай на новую якасную ступень.

Сілкуемае эмацыянальнымі плынямі вялікай музыкі, дзе ідэалагічныя характарыстыкі падаваліся ў лаяльнай форме, у Еўропе ўзнікае бясконца разнастайнае ўтварэнне, якое называюць рухам рамантызму.

Ён з’явіўся рэакцыяй на Асветніцтва, якое абумовіла пэўныя светапоглядныя параметры, падрыхтаваўшы для гэтага глебу сваёй паслядоўнай і ўсёахопнай секулярызацыяй культуры, стварыўшы іншы стандарт каштоўнасцей. Рамантыкі выступілі супраць прынятых этычных і эстэтычных нормаў. Энергічнай і страснай індывідуальнай свабодзе асобы сталі перашкаджаць грамадская мараль, грамадскія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўмоўнасці і рост сучасных эканамічных арганізацый. Аднароднасць свету, як яго ўяўлялі асветнікі, механічнасць і рацыянальнасць Асветніцтва адмаўляюцца рамантыкамі, набываючы праз дваенне свету дваістасць і разарванасць свайго існавання. Узніклы раскол быцця на нізка празаічную і ўзвышана паэтычную рэальнасць зрабілі чалавека прыналежным свету прозы (гэта паўсядзённасць з яе утылітарызмам, разважнасцю, механічнасцю) і свету паэзіі, які адкрывае чалавеку ісціну, дабрыню і прыгажосць, арганічную звязнасць і пранікальнасць усяго ва ўсім. Рысы, проціпастаўленыя рамантызмам Асветніцтву, характарызуюць уласную логіку развіцця і вынікаюць з імкнення аднавіць разарваныя або аслабленыя сувязі ў культуры. Дзякуючы сваёй універсальнасці, выступаючы за пераадоленне ўсякай нецярпімасці, вузкасці, рамантызм упершыню ў гісторыі еўрапейскай культуры стаў ідэйна-мастацкім цячэннем, не маючым саслоўных межаў, і тым самым паклаў пачатак дэмакратызацыі культуры. Любая індывідуальнасць, а таксама народ і ў цэлым чалавецтва для рамантыка цікавыя. Не выпадкова пры адмаўленні “культу розуму”, імкненні непасрэдна ўздзейнічаць на пачуцці ўсіх людзей асобае месца ў мастацтве рамантызму заняла музыка. Разнастайнасць музыкі, на думку Й. Хейзінга, прыносіць “задавальненне, адпачыванне, радасць і душэўны ўздым” незалежна ад нацыянальнасці і саслоўнай прыналежнасці. Менавіта з рамантызму пачалося разуменне іншых эпох і культур, у якіх чужое і далёкае не патанае і не растае. Незвычайная і нябывалая чуйнасць рамантыкаў у спасціжэнні культуры ў прасторы і часе шчыльна звязана з іх успрыманнем свету як арганічнага цэлага, усе часткі якога неабходныя і ўзаемна дапаўняюць адна адну. Сказанае садзейнічала дасягненню чалавекам паўнаты і цэласнасці быцця. Рацыянальна пабудаванае існаванне, якое забяспечвае чалавеку знешнюю разважнасць і ўнутраную ўпарадкаванасць, выклікае ў рамантыкаў пагарду, таму што такі чалавек адарваны ад вытокаў быцця і не звязаны з су- светным цэлым.

Асветніцтва разам з рамантызмам захаваліся ў заходняй культуры і засталіся сучаснымі. Сучаснымі ў тым сэнсе, што ўсе наступныя з’явы культуры гэта мадыфікацыі Асветніцтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

або рамантызму з іх традыцыямі. Актуальнасць комплексу праблем, пастаўленых эпохай Асветніцтва, з часам узрастала і выходзіла за межы “веку Асветніцтва” і асветніцкай ідэалогіі, сцвярджаючы іх паўнату і універсальнасць, уласцівыя нашаму грамадству і яго свядомасці.


1. *Барг М. А.* Эпохи и идеи. – М., 1987. – С. 325–328, 330–332, 335, 336–338.

2. *Бёрк Э.* Философские исследования о происхождении наших идей возвышенного и прекрасного. – М., 1979. – С. 46–47.

3. *Вебер А.* Избранное: Кризис европейской культуры. – СПб., 1999. – С. 418–432.

4. *История* Европы. Европа нового времени (XYII–XYIII века). – М., 1994. – С. 300, 306–307.

5. *Кареев Н.И.* Общий ход всемирной истории. – СПб., 1903. – С. 145–155, 168–170, 190–198.

6. *Кертман Л.Е.* История культуры стран Европы и Америки 1870–1917. – М., 1987. – С. 83–85, 93, 95–100.

7. *Культурология* / Под ред. Г.В.Драча. – Ростов-на-Дону, 1995. – С. 260–261.

8. *Рассел Б.* Движение романтизма // История западной философии. – Ростов-на-Дону, 1998. – С. 763–773.

9. *Сапронов П.А.* Культурология. – СПб., 2001. – С. 430–445.

10. *Тарнас Р.* История западного мышления. – М., 1995. – С. 310–320.

11. *Теплиц К.Т.* Всё для всех. – М., 1996. – С. 22.

12. *Токвиль Д.* Старый порядок и революция. – М., 1997. – С. 166.

13. *Хатчесон Ф., Юм Д., Смит А.* Эстетика. – М., 1973. – С. 310, 318, 321.

14. *Хевеши М.А.* Толпа, массы, политика. – М., 2001. – С. 22.

15. *Хейзинга Й.* Homo Ludens. Человек играющий. – М., 2001. – С. 298–302.

16. *Хобсбаум Э.* Век революции. Европа. 1789–1848. – Ростов-на-Дону, 1999. – С. 369.

17. *Хоум Г.* Основания критики. – М., 1977. – С. 553.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ